***Н. П. Цімашэнка***
*г. Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны*

# ЭЛЕКТРОННЫ ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС “ПРАКТЫКУМ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ: ПУНКТУАЦЫЯ”

Факультатыўная дысцыпліна “Практыкум па беларускай мове: пунктуацыя” займае важнае месца ў сістэме лінгвістычных дысцыплін для студэнтаў 3 курса спецыяльнасці “Беларуская філалогія” (літаратурна- рэдакцыйная дзейнасць). Неабходнасць вывучэння данай дысцыпліны прадугледжана стандартам і вучэбным планам падрыхтоўкі спецыялістаў- філолагаў. Засваенне вышэйназванага курса мае на мэце даць студэнтам грунтоўныя веды пра моўныя з’явы ў галіне беларускай пунктуацыі.

Пунктуацыя выконвае важную ролю пры афармленні пісьмовай мовы. Актуальнасць факультатыва “Практыкум па беларускай мове: пунктуацыя” тлумачыцца тым, што пры напісанні разнастайных артыкулаў у газеты і часопісы, пры афармленні дакументацыі журналіст- філолаг і выкладчык-філолаг павінны выдатна валодаць не толькі нормамі сучаснай арфаграфіі, але і правіламі пастаноўкі знакаў прыпынку. У курсе “Сучасная беларуская мова. Сінтаксіс” на пунктуацыю адводзіцца ўсяго некалькі гадзін, а гэтага недастаткова для будучага філолага. Акрамя таго, спецыялісту неабходна засвоіць не толькі знакі прыпынку, якія адпавядаюць нормам сучаснай беларускай мовы, але і аўтарскія знакі прыпынку, якія могуць выходзіць за межы нормы. Асабліва гэта датычыцца публіцыстычнага тэксту і тэкстаў мастацкай літаратуры, дзе аўтарская пастаноўка знака прыпынку можа падкрэсліваць пэўную інфармацыю, на якой неабходна засяродзіць увагу чытача, а можа выдзяляць патрэбную для аўтара сінтаксічную канструкцыю з мэтай зацікавіць таго, хто, напрыклад, чытае газету або часопіс, вершаваныя радкі або прозу. Акрамя таго, даўно вядома, што ёсць сінтаксічныя канструкцыі, у якіх ад пастаноўкі знакаў прыпынку залежыць сэнс выказвання (Класічным прыкладам такой канструкцыі з’яўляецца вядомы рускі выраз *Казнить нельзя помиловать*.). Так, у сказе *Ведаеце, хацелася б, каб сабралі такіх людзей, якія трымаюць кароў, у адным месцы* (“Звязда”, 2.09.11) апошняя коска ўплывае на сэнс выказвання. У сувязі з гэтым разгляд усіх правіл сучаснай беларускай пунктуацыі ажыццяўляецца ў электронным комплексе на матэрыяле твораў мастацкай літаратуры і перыядычных выданняў рознага характару.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Неабходна дадаць, што праблема сувязі паміж пунктуацыяй і сінтаксісам з'яўляецца тым аспектам даследавання моўнай структуры, які выклікае шмат спрэчак, але па-ранейшаму прыцягвае ўвагу моваведаў. Асаблівую цікавасць уяўляе сабой праблема адасаблення даданых членаў сказа, пабочных канструкцый, параўнальных зваротаў і г.д.; пастаноўкі працяжніка паміж дзейнікам і выказнікам; аднароднасці – неаднароднасці азначэнняў і іншых цяжкіх момантаў у сінтаксісе і пунктуацыі.

Асноўнай мэтай факультатыва з'яўляецца набыццё ведаў у галіне беларускай пунктуацыі і засваенне правіл пастаноўкі ўсіх магчымых знакаў прыпынку ў пісьмовым тэксце. У задачы курса ўваходзіць наступнае: засваенне дастатковай колькасці тэарэтычных ведаў для ўсведамлення пунктуацыі як самастойнай лінгвістычнай навукі; фарміраванне ўяўленняў студэнтаў пра асноўныя паняцці пунктуацыйнай сістэмы беларускай мовы, аспекты і метады пунктуацыйна-сінтаксічнага даследавання моўнага матэрыялу; набыццё ўменняў і навыкаў выкарыстання тэарэтычных ведаў для вырашэння канкрэтных лінгвістычных задач у галіне пунктуацыі; заахвочванне студэнтаў да навукова-даследчай работы па пунктуацыі; авалоданне ўстойлівымі навыкамі самастойнай інтэрпрэтацыі моўных з'яў, звязаных з пастаноўкай знакаў прыпынку. На факультатыве асвятляюцца асноўныя пытанні сучаснай беларускай пунктуацыі, выяўляецца яе сувязь з сінтаксісам на матэрыяле мовы газет, часопісаў, твораў мастацкай літаратуры. Для паспяховага засваення факультатыўнай дысцыпліны неабходна валодаць і выкарыстоўваць веды па сінтаксісе, марфалогіі, а таксама культуры і стылістыцы беларускай мовы. ЭВМК "Практыкум па беларускай мове: пунктуацыя" распрацаваны на аснове практычных і лекцыйных заняткаў і складаецца з тлумачальнай запіскі, тэматычнага плана, зместу вучэбнага матэрыялу, тэарэтычнага і практычнага раздзелаў, тэставых заданняў і практыкаванняў, пытанняў для самакантролю, тэарэтычнага мінімуму, спісу літаратуры.

Тэарэтычны раздзел утрымлівае матэрыял, падзелены на тэмы і прызначаны для аўдыторнай работы са студэнтамі, а таксама для іх самастойнага вывучэння. Дзякуючы зместу гэтых выдзеленых тэм студэнты змогуць атрымаць уяўленне аб гісторыі развіцця беларускай пунктуацыйнай сістэмы, авалодаць яе асновамі, пазнаёміцца са структурай беларускага тэксту. Тэарэтычны матэрыял дазваляе зарыентавацца ў паняційным апараце пунктуацыі і адпаведных тэрмінах. У кожнай тэме выдзелены пытанні для абмеркавання, раскрыты асноўныя палажэнні і змест

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

кожнага. Тэарэтычны раздзел уключае ў сябе дванаццаць тэм. У тэме “Пунктуацыя як навука” разглядаецца прадмет вывучэння, задачы, якія стаяць перад студэнтамі ў працэсе навучання пунктуацыі. Падаюцца звесткі з гісторыі ўзнікнення і развіцця пунктуацыі, прыводзіцца класіфікацыя і асноўныя правілы ўжывання знакаў прыпынку. У тэме “Працяжнік у простым сказе” падкрэсліваюцца абавязковыя выпадкі пастаноўкі працяжніка паміж дзейнікам і выказнікам, разглядаецца працяжнік на месцы пропуску слоў у сказе, інтанацыйны (аўтарскі) працяжнік, спалучальны (злучальны) працяжнік. Тэма “Знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі” прысвечана аднародным членам сказа, звязаным бяззлучнікавай сувяззю і пры дапамозе злучнікаў. Пільная ўвага надаецца аднародным і неаднародным азначэнням. Разглядаюцца выпадкі ўжывання абагульняльнага слова пры аднародных членах сказа. У тэме “Знакі прыпынку ў сказах з адасобленымі членамі” аналізуюцца ўмовы адасаблення даданых членаў сказа, супастаўляюцца паняцці паяснення і ўдакладнення. У тэме “Знакі прыпынку пры пабочных і ўстаўных канструкцыях” увага засяроджваецца на адрозненнях паміж пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі і сінтаксічнымі спалучэннямі, падобнымі да іх. Знакі прыпынку пры параўнальных зваротах, знакі прыпынку пры сінтаксічных канструкцыях, падобных да параўнальных зваротаў, – усё гэта разглядаецца ў тэме “Знакі прыпынку пры канструкцыях са злучнікам ЯК”. Тэма “Знакі прыпынку ў складаназлучаным сказе” прадугледжвае аналіз складаназлучаных сінтаксічных канструкцый: коска ў складаназлучаным сказе, кропка з коскай у складаназлучаным сказе, працяжнік у складаназлучаным сказе, адсутнасць знакаў прыпынку паміж часткамі складаназлучанага сказа. У тэме “Знакі прыпынку ў складаназалежным сказе” разглядаюцца асноўныя пунктуацыйныя правілы: коска ў складаназалежным сказе, працяжнік і двукроп’е ў складаназалежным сказе, знакі прыпынку ў складаназалежным сказе з некалькімі даданымі. Тэма “Знакі прыпынку ў бяззлучнікавым складаным сказе” накіравана на разгляд усіх магчымых знакаў прыпынку паміж прэдыкатыўнымі часткамі бяззлучнікавых складаных сказаў. Значнае месца тут адводзіцца і канструкцыям тыпу *М. Багдановіч: жыццёвы і творчы шлях*. У тэме “Знакі прыпынку ў складаным сказе з рознымі відамі сувязі” падаюцца прынцыпы пастаноўкі знакаў прыпынку, адсутнасць знакаў прыпынку і спалучэнне знакаў прыпынку ў складаным сказе з рознымі відамі сувязі. Тэма “Знакі прыпынку пры перадачы чужой мовы” займае важнае месца ў сістэме

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

пунктуацыйных правіл беларускай мовы, паколькі валоданне гэтымі нормамі неабходна пры разглядзе тэкстаў мастацкай літаратуры, у якіх найбольш прадстаўлены словы розных герояў. Тэма важная і пры напісанні курсавых і дыпломных работ, паколькі гэты від працы кожнага студэнта патрабуе выкарыстання цытат. У межах гэтай тэмы вывучаюцца знакі прыпынку пры простай мове, пры няўласна-простай мове, пры дыялогах, пры цытатах. Тэма “Спалучэнне знакаў прыпынку” з’яўляецца апошняй у тэарэтычнай частцы ЭВМК і прадстаўляе сабой абагульненне ўсіх вышэйадзначаных тэм.

Практычны раздзел уключае ў сябе ў адпаведнасці з вучэбным планам дысцыпліны 17 практычных заняткаў (34 гадзіны). Кожная тэма практычных заняткаў складаецца з пытанняў для самаправеркі і сістэмы заданняў для выканання студэнтамі ў вуснай і пісьмовай форме. Практычны матэрыял арыентаваны на замацаванне тэарэтычных звестак па важнейшых тэмах дысцыпліны.

Раздзел кантролю ведаў прадстаўлены тэставымі заданнямі, якія могуць быць выкарыстаны пры правядзенні бягучага і выніковага кантролю ведаў, уменняў і навыкаў, а таксама для самаправеркі студэнтамі свайго ўзроўню тэарэтычных ведаў і практычных уменняў і навыкаў.

Дапаможны раздзел утрымлівае дадатковы матэрыял, што ўключае ў сябе тэарэтычны мінімум, у які ўваходзяць асноўныя паняцці сінтаксісу і пунктуацыі, якімі павінен валодаць кожны студэнт. У дапаможным раздзеле змешчаны спіс літаратуры для выкарыстання студэнтамі ў ходзе вывучэння факультатыўнай дысцыпліны “Практыкум па беларускай мове: пунктуацыя”.

Такім чынам, электронны вучэбна-метадычны комплекс “Практыкум па беларускай мове: пунктуацыя” ўяўляе сабой электронную крыніцу, якая ўключае сістэматызаваныя ў навуковым і метадычным плане матэрыялы па дысцыпліне і забяспечвае ўмовы для розных відаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў-філолагаў.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ